## Тэксты пятроўскіх замоў

1. **“Замаўляць Пятрака”**

( у форме дыялога між жанчынай і астатнім карагодам)

*“Это я яшчэ помню казалі, трэба Петрака замаўляць, угаворваць:*
*- Пятрок-петрачына ў чым твая прычына?*
*- У кароткай начы.*
*- Пятрок-петрачына, толькі сонейка зайшло а ўжо усходзіць.*
*- Пятрова ночка маленька.*
*-Агонь гарыць-палае, зямелька замоў вымагае, пара ураджай замаўляць. Дванаццаць разоў, на дванаццаць канцоў слова добрае сказаць.”*

Запісаў Сяргей Георгіевіч Выскварка ў 1998 годзе у в. Шыпілавічы Любанскага раёна Мінскай вобласці ад Анастасіі Іванаўны Баярын 1934 г.н..

2. **“Соль на агонь кідаць”**

*“Мая бабуля казала што некалі жанчыны сыпалі са жмені соль у агонь і спецыяльныя словы выказвалі, як бы замова такая. От ідуць кругом агню сыпне солі ў полым’я і скажа а далей другая і одэтак, мабыць дванацаць жанчын трэба. І такія словы прыгожыя. Я ж запомніла:*
*- Пятрок-петрачына, выспявай даспеляй: і у полі, і у лесе, і на лузе, і ў рацэ, і на поплаве, і на сенажаці.*
*- Пятрок-петрачына прыспары ў збажыне, каб з каласочка поўная бочка.*
*- Пятрок-петрачына прыспары ў ярыне, каб з кожнага снапочка па мяшэчку*
*- Пятрок-петрачына прыспары ў бульбай, каб з карча па кашалю а з баразны па вазу.*
*- Пятрок-петрачына прыспары ў грэцы, каб умалотна і прымалотна.*
*- Пятрок-петрачына прыспары ў ячмені каб з каласочка да па чатыры жмені.*
*- Пятрок-петрачына прыспары ў пшаніцы, каб з постаці па сем вазоў, а з дзвюх у сем разоў.*
*- Пятрок-петрачына прыспары ў ляночку, каб з кожнага снапочка было на сарочку.*
*- Пятрок-петрачына прыспары ў полі вялікімі вазамі.*
*- Пятрок-петрачына прыспары ў лесе поўнымі кашалямі.*
*- Пятрок-петрачына прыспары ў рацэ шырокімі мяхамі.*
*- Пятрок-петрачына прыспары ў сенажаці высокімі стагамі.*
*- Пятрок-петрачына прыяй пагодаю і нагодаю і работаю.*

Запісаў Сяргей Георгіевіч Выскварка ў 1998 годзе у в. Шыпілавічы Любанскага раёна Мінскай вобласці ад Анастасіі Іванаўны Баярын 1934 г.н..